ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр адукацыі
Рэспублікі Беларусь
А.В.Карпенка
15 . 2021

# СПЕЦЫФІКАЦЫЯ
тэста па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі»
для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання
ў 2022 годзе

1. Прызначэнне тэста – аб’ектыўнае ацэньванне ўзроўню падрыхтоўкі асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю і жадаюць працягнуць навучанне ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

2. Змест тэста адпавядае Праграме ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, 2022 год, зацверджанай загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11.11.2021 № 768.

3. Якасць тэста забяспечваецца экспертызай тэставых матэрыялаў на прадмет змястоўнай валіднасці, навуковай верагоднасці, сістэмнасці, значнасці, рэпрэзентатыўнасці элементаў зместу, комплекснасці і збалансаванасці, адпаведнасці зместу заданняў заяўленаму ўзроўню складанасці.

4. Эквівалентнасць розных варыянтаў тэста забяспечваецца іх фарміраваннем у адпаведнасці з адзінымі метадычнымі патрабаваннямі і спецыфікацыяй; адборам заданняў, якія маюць аднолькавы ўзровень складанасці і адпавядаюць адным і тым жа элементам зместу курса гісторыі Беларусі.

5. Тыпы заданняў

Частка А ўключае заданні закрытага тыпу, выкананне якіх прадугледжвае выбар аднаго правільнага адказу з пяці прапанаваных. Частка В уключае заданні адкрытага тыпу, пры выкананні якіх неабходна сфармуляваць адказ і афарміць яго ў выглядзе лічбаў, слова, словазлучэння, спалучэння літар і лічбаў.

6. Колькасць заданняў у адным варыянце тэста – 44.

Частка А – 28 заданняў.

Частка В – 16 заданняў.

7. Структура тэста

Раздзел 1. Беларускія землі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. – 7 заданняў (16 %).

Раздзел 2. Беларускія землі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст. – 6 заданняў (14 %).

Раздзел 3. Беларускія землі ў другой палове XVI – XVIII ст. – 8 заданняў (18 %).

Раздзел 4. Беларусь у XIX – пачатку XX ст. – 9 заданняў (20 %).

Раздзел 5. Беларусь у 1917–1945 гг. – 8 заданняў (18 %).

Раздзел 6. Беларусь у другой палове 1940-х – 1980-я гг. – 3 заданні (7 %).

Раздзел 7. Рэспубліка Беларусь у 1990-я гг. – пачатку XXI ст. – 3 заданні (7 %).

8. Узроўні складанасці

Заданні ў тэсце размеркаваны па ўзроўнях складанасці наступным чынам:

I – 2 заданні (5 %);

II – 8 заданняў (18 %);

III – 18 заданняў(41 %);

IV – 12 заданняў(27 %);

V – 4 заданні(9 %).

9. Праграмны матэрыял для распрацоўкі тэставых заданняў

Раздзел 1. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА СЯРЭДЗІНЫ XIII ст.

Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі ў перыяды каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.

Насельніцтва беларускіх зямель у Раннім сярэднявеччы.

Дзяржаўнасць усходніх славян. Княствы на тэрыторыі Беларусі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст.

Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства.

Культура беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст.

Раздзел 2. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ).

Унутрыпалітычная абстаноўка і знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIII – 70-я гг. XIV ст.

Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XIV – XV ст.: унутраная і знешняя палітыка.

Палітычнае становішча ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст.

Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання ў ВКЛ.

Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ў ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст.

Фарміраванне беларускай народнасці.

Рэлігійнае жыццё на беларускіх землях у другой палове XIII – першай палове XVI ст.

Культура Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст.

Раздзел 3. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – XVIII ст.

Утварэнне Рэчы Паспалітай. Становішча ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.

Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай і яе падзелы.

Знешняя палітыка ВКЛ і Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст.

Беларусь падчас войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.

Сельская гаспадарка і гарадское жыццё ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVI – першай палове XVII ст.

Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.

Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI – першай палове XVII ст.

Адукацыя і навука Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст.

Культура Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст.

Раздзел 4. БЕЛАРУСЬ У XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Грамадска-палітычная абстаноўка ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX – пачатку XX ст. у Беларусі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст.

Буржуазныя рэформы на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст.

Развіццё капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Беларусь у сістэме міжнародных адносін у XIX – пачатку XX ст.

Фарміраванне беларускай нацыі. Эвалюцыя канфесійных адносін у XIX – пачатку XX ст.

Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.

Культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Раздзел 5. БЕЛАРУСЬ У 1917–1945 гг.

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і ўстанаўленне савецкай улады ў Беларусі.

Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў 1917–1920 гг.

Грамадска-палітычнае жыццё Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) у 1920–1930-я гг.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1918–1930-я гг.

Беларусь ва ўмовах заканчэння Першай сусветнай і польска-савецкай вайны.

Становішча Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы.

Пачатак Другой сусветнай вайны.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Германскі акупацыйны рэжым у Беларусі.

Барацьба беларускага народа супраць германскіх акупантаў.

Вызваленне БССР ад германскіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

Развіццё беларускай нацыі ва ўмовах савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.

Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920–1930-я гг.

Культура Заходняй Беларусі.

Раздзел 6. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х – 1980-я гг.

Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг.

БССР на міжнароднай арэне ў 1940–1980-я гг.

Развіццё беларускай савецкай культуры ў другой палове 1940-х – 1980-я гг.

Раздзел 7. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ У 1990-я гг. – ПАЧАТКУ XXI ст.

Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.

Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь на рубяжы XX–XXI стст.

Беларуская нацыя ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Развіццё адукацыі і навукі, культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь.

10. Аб’екты кантролю

Тэст па гісторыі Беларусі прызначаны для праверкі вучэбных дасягненняў.

Абітурыент павінен ведаць:

– асноўны тэарэтычны і фактaлагічны матэрыял па гісторыі Беларусі са старажытных часоў па 2021 год;

– асаблівасці дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, геапалітычнага, этнаканфесійнага развіцця беларускага народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Абітурыент павінен умець:

– вызначаць храналагічную паслядоўнасць гістарычных падзей і працэсаў, іх працягласць;

– суадносіць гістарычныя з’явы і працэсы гісторыі Беларусі з агульнаеўрапейскімі;

– лакалізаваць на картасхеме гістарычныя падзеі, з’явы і працэсы;

– характарызаваць грамадска-палітычнае, эканамічнае, геапалітычнае, культурнае развіццё Беларусі на розных этапах гістарычнага развіцця;

– характарызаваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры;

– устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі, з’явамі і працэсамі;

– сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты;

– параўноўваць гістарычныя факты, з’явы і працэсы;

– суадносіць адзін з другім розныя пункты гледжання адносна адных і тых жа гістарычных фактаў, з’яў і працэсаў;

– канкрэтызаваць тэарэтычныя вывады і змест гістарычных паняццяў;

– праводзіць аналіз зместу розных гістарычных крыніц;

– суадносіць тэкставую і візуальную інфармацыю.

11. Час выканання тэста – 90 мінут.

12. Рэзультаты выканання тэста ацэньваюцца згодна з Методыкай падліку рэзультатаў цэнтралізаванага тэсціравання, якая зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар
УО «Рэспубліканскі інстытут
кантролю ведаў» Ю.І.Міксюк